БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне у ЗША
Published by Byelorussian - American Association, Inc.
Address — Адрыс: Byelorussian-American Association, Inc.
435 New Jersey Ave, Brooklyn 7, N. Y., U. S. A.
Падпіска на год $ 2.50 — Subscription per year — $ 2.50
Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія

PRICE 10 ¢ ЧАСАПІС БЕЛАРУСАУ У З. Г. А. BYELARUS — BYELORUSSIAN NEWSPAPER IN THE USA 10 ЦЭНТАЎ

Год III. № 13 (19) 18 Кастрычніка 1952 г. NEW YORK, N. Y., U. S .A. October 18, 1952 Vol. III. № 13 (19)

19-ты зьезд камуністычнае партыі

5-га кастрычніка ў Маскве адчыніўся 19-ты зьезд ВКП(б), упяршыню пасьля трынаццацёх год перапынку. Сюды зьехаліся дэлегаты з усяе СССР, а таксама й камуністыя зь іншых краінаў, — разам больш 2000 асобаў. Прысутнічае на зьезьдзе і ўсё Палітбюро (якое мае быць зьліквідавана) на чале із Сталіным. Аднак, у прэзыдыюм зьезду не увайшлі із складу Палітбюра Мікаян, Касыгін, Шврнік і Андрэяў. Затое ўвайшлі ў прэзыдыюм некаторыя „нацыянальныя" партыйныя правадыры, у тым ліку новы сакратар кампартыі Беларусі Патолічаў.

У першым дні зьезду з дакладамі выступілі Маленкоў і Молатаў. Маленкоў гаварыў аб „вялізарных дасягненьнях" Савецкага Саюзу ў галіне савецкае прапрамысловасьці, спыніўшыся й на атамнай энэргіі, якая быццам ідзе ў Саветах выключна на „мірныя" мэты, і колькасьць якое ўжо далёка пакінула ззаду ЗША. Маленкоў прывёў цікавыя лічбы з галіны савецкае прадукцыі, параўноўваючы іх з лічбамі з 1950 году. Калі верыць ягоным словам, вытворчасьць савецкіх фабрыкаў ды заводаў узрасла на мільёны тонаў. Асабліва, быццам, павялічылася прадукцыя электрычнае энэргіі — з 87-ёх мільярдаў кіляват гадз. на 117 мільярдаў к. гадзінаў.

Але найбольш словаў прысьвяцілі ў сваіх прамовах як Молатаў, гэтак і Маленкоў ненавісьці, хлусьні й лаянцы, накіраваных проці Амэрыкі, якая, як было сказана, „апранулася ў тогу Гітлера" й пнецца сяньня да свае „злачыннае мэты" проці мірных народаў, а ў першую чаргу, — проці СССР. Наадварот, прамоўцы намагаліся размаляваць „міралюбнасьць" Савецкага Саюзу ўсімі магчымымі колерамі. Дарма што так, Молатаў усё-ж зацеміў у сваёй прамове, што „Савецкі Саюз цяпер ужо не адзін, па ягоным баку 600 мільёнаў людзеў."

У другім дні зьезду выступіў із вялікай прамовай галава МВД й заступнік Сталіна — Бэрыя. Ён таксама казаў аб удачах СССР на гаспадарчым фронце, але аддаў галоўную ўвагу ізноў-жа „разаблачэньню" Амэрыкі, выкрыцьцю ейных „правакацыяў у Эўропе ды Азыі", „дывэрсыйных чынаў" супроць СССР, куды яна, быццам, „ня супыняецца слаць сваіх шпікоў".

У тым самым дню прамаўлялі і маршал Васілеўскі, міністар абароны СССР. Ён папярэджваў Амэрыку й іншых „агрэсараў", што мірную й міралюбную палітыку Саветаў нельга прыймаць за слабасьць. Бо калі будзе трэба, „Савецкі Саюз пакажа сваю моц усім, хто адно наважыцца на яго напасьці".

У шостым дні зьезду рабіў даклад старшыня Дзяржплану Сабураў. Гаварыў ён пераважна аб новай пяцігодцы. Між іншым, ён паведаміў аб праводжанай дэцантралізацыі савецкае прамысловасьці і аб перанясеньні шмат якіх фабрыкаў і прадпрыемстваў у глыбіню Сібіры, дзе іх лягчэй будзе бараніць перад магчымымі ў будучыні варожымі нападамі з паветра.

Газэта „Праўда", падаючы аб прабегу зьезду, цешыцца, што на зьезьдзе прысутнічаюць прадстаўнікі 44-ох камуністычных партыяў розных краінаў і гаспадарстваў, у тым ліку прадстаўнікі Бразылійскае ды Інданэзыйскае Кам. партыяў. Амэрыканскіх камуністых на зьезьдзе няма.

Апошнім мае прамаўляць на зьезьдзе сам Сталін.

МАСКВА

19-ты Зьезд ВКП(б) мае неўзабаве падаўсьці да найважнейшых пытаньняў і да выбараў Прэзыдыюму, які заменіць былое палітбюро. У ліку іншых прамоўцаў на зьезьдзе выступаў кагадзе й маршал Булганін. Як і ўсе ягоныя папярэднікі, ён не сказаў нічога новага, прысьвяціўшы бліжу ўсю сваю прамову застрашваньню ЗША.

ПРАДСТАЎНІКІ АД САВЕЦКАЕ БЕЛАРУСІ ЕДУЦЬ У НЮ-ЁРК.

Згодна із паведамленьнем агэнцыі Рэтар, амбасада ЗША падпісала візы на ўезд у Амэрыку васьмём беларусом — прадстаўнікоў падсавецкае Беларусі на сэсыю генэральнае асамблеі Задзіночаных Нацыяў, якая пачалася ў Нью-Ёрку у гэтым тыдні. Побач з беларусамі, візы на асамблею атрымалі й 11 прадстаўнікоў савецкае Украіны.

Няма сумліву, што ўсе гэтыя „нацыянальныя" прадстаўнікі — асобы, дасканала праверыныя органамі НКВД (МВД). Сумлёўна таксама, ці ўсе яны запраўды беларусы й патрапяць гутарыць пабеларуску. Няма-ж сумліву ў тым, што галасаваць яны будуць дружна й аднагалосна за ўсе прапановы крамлёўскіх дыктатараў проці найлепшых прапановаў заходняга сьвету. Бо той, хто патрапіць яшчэ мець собскія погляды ці думкі, — нікуды за межы савецкага саюзу ня вытыркне й носу.

НЮ-ЁРК.

14-га кастрычніка ў 11 гадз. раніцы ў Нью-Ёрку адчынілася сёмая сэсыя Задзіночаных Нацыяў. На сэсію зьехалася каля тысячы прадстаўнікоў з 60-цёх краінаў сьвету.

Вышынскі й Грамыка, шырака ведамыя сьвету прадстаўнікі Савецкага Саюзу, прыехалі ў Нью-Ёрк на параплаве „Квін Элізабэт" напярэдадні адчыненьня сэсыі. Зь вялікага натоўпу цікавых, што прыглядаліся прыезду савецкае дэлегацыі на прыстані, разьлягаліся галасы: „Забойцы, варочайцеся, адкуль прыехалі!"

Першае паседжаньне Задзіночаных Нацыяў адчынілася ў новым доме Асамблеі, які каштаваў звыш 12-цёх мільёнаў даляраў. Пачалося яно асьвячэньнем будынку. Праца сэсыі пачалася ў 3 гадз. пап.

На сёмай сэсыі Задзіночаных Нацыяў маюць быць разгледжаныя 72 пытаньні. Адным з першых мае выступіць з вялікай прамовай дзяржаўны сакратар ЗША Д. Эчысон, які зьбіраецца запрапанаваць дэлегатам патрабаваць ад Паўночнае Карэі згоды на падпісаньне пагадненьня. Нямаведама, што думае ён рабіць у выпадку, калі чырвоныя на гэтае патрабаваньне не пагодзяцца, а гэта бліжу што пэўнае.

Пачатак запраўднага змаганьня з савецкаю дэлегацыяй чакаецца, усё-ж, не раней пачаткаў лістапада, калі ў ЗША ўжо будзе па выбарах.

СПРАВА ПАСЛА КЭННЭНА.

Амэрыканскі ўрад зьвярнуўся да Савецкага ўраду з досыць станоўкай, хоць панашаму й недаволі войстрай нотай у справе нячуванага ў дыпляматычным сьвеце патрабаваньня Саветаў адклікаць пасла ЗША у Маскве Кэннэна, які знаходзіцца цяпер па справах у Заходняй Эўропе.

Як прычыну гэтага, бальшавіцкі ўрад падае „манлівыя нагаворваньні пасла Кэннэна на Савецкі Саюз". Гэткімі „нагаворваньнямі" было асьветчаньне Кэннэна, быццам замежныя дыпляматы чуюцца ў Маскве зусім як у Нямеччыне за часоў Гітлера, што бязумоўна шчырая праўда.

Кагадзе Саветы адказалі на гэтую пратэстацыйную ноту Амэрыкі, ведама, адкідаючы ўсе ейныя патрабаваньні. Пасол Кэннэн, відаць, у Маскву ўжо ня вернецца. Як скончыцца ўся гэтая нячуваная справа — пакажа будучыня.

КАРЭЯ

У Карэі змаганьне стаецца дзень па дні ўсё больш зацятым. Розныя важныя стратэгічныя пункты й вышыні пераходзяць з рук у рукі па колькі раз. Чырвоныя згубілі апошнімі днямі цэлую дывізыю ў 9.000 чалавек. Ня спыняецца й змаганьне у паветры, дзе перамагаюць, як і дагэтуль, амэрыканцы.

Перамовы ў Карэі спыненыя на неабмяжаны час. Бальшавікі, ведама, абвінавачваюць у гэтым саюзную дэлегацыю, на чале з амэрыканцамі.

ФРАНЦЫЯ

Днямі тут здарылася прыкрае дыпляматычнае непаразуменьне паміж Урадам Францыі і ЗША. Прычынаю яго сталася дыпляматычная нота Амэрыканскага ўраду, даручаная францускаму прэм'ер міністру Пінэ амэрыканскім паслом Доннам.

Нота гэтая, даручаная Пінэ із вялікім спазьненьнем паведамляла аб паменшаньні грашовае дапамогі Францыі з 650 міл. на 500, радзячы францускаму ўраду пакрыць розьніцу з падаткаў, якія плацяць усе амэрыканцы, дык павінны плаціць і французы. Гэта вельмі не спадабалася Пінэ. Ён палічыў ноту „абразьлівай для гонару Францыі". Францускія газэты ўсьлед пачалі антыамэрыканскую кампанію. Праўда, справа неяк заладзілася, але амэрыканскафранцускія дачыненьні папсаваліся. Сталін з гэтага, пэўне, вельмі цешыцца.

ЮГАСЛАВІЯ-ТУРЦЫЯ-ГРЭЦЫЯ

Югаслаўская ваенная дэлегацыя наведала Грэцыю й Турцыю. У бліжэйшым часе маюць наведаць Югаславію ваенныя дэлегаты Турцыі ды Грэцыі. У часе гэтых адведзінаў мае быць абмяркаваны плян супольных ваенных дзеяньняў гэтых трох дзяржаваў на выпадак нападу з Усходу. Югаслаўская дэлегацыя, як быццам, вярнулася з турэцкае сталіцы Анкары й грэцкіх Афінаў із вельмі добрымі ўражаньнямі адносна як ваеннага, гэтак і палітычнага палажэньня гэтых краінаў.

НЯМА МЕСЦА ДЛЯ АПТЫМІЗМУ

Прэмію свабоды за 1952 год атрымалі сёлета галоўнакамандуючы войскамі НЭЙТО ў Эўропе ген. Рыджвэй і прэзыдэнт Гарвардзкага Унівэрсытэту Конэнт. У сувязі з атрыманьнем гэтае ганаровае ўзнагароды, ген. Рыджвэй меў кагадзе прамову, у якой рашуча адкідаў чуткі аб тым, быццам магчымы агрэсар ня імкнецца да новае вайны, ды што ён яшчэ не гатовы да яе. Зазначыўшы вялікія ўдачы ў справе абароны Эўропы, генэрал сьцьвердзіў, аднак, што няма месца для аптымізму ці ўцехі, бо дзяржавам НЭЙТО і надалей пагражае вялікая небясьпека.

Музэйны рэквізыт

У Амэрыканскім Камітэце Вызваленьня „Народаў Расеі" сёлета — частыя зьмены старшыняў. Горш, нажаль, тое, што за імі ня відаць выразных зьменаў на лепшае ды паправак немалых палітычных памылак таго Камітэту, які пры належнай пастаноўцы справы мог-бы сыграць ражную ролю ў актывізацыі й каардынацыі вызвольнага змаганьня народаў СССР. У выніку — Камітэт ужо другі год як топчацца на месцы бяз выразных палітычных вынікаў.

Шмат недохопаў выказаў Камітэт як у пастаноўцы прынцыповых пытаньняў, так і у тактыцы свайго наступаньня. Пачнем „з галавы" ды займемся сяньня тут адною, калі не галоўнаю па важнасьці, дык затое першаю паміж іншымі справамі: палітычна няўдалым назовам самага Камітэту із словамі „Народаў Расеі".

Сьведама ці нясьведама зь нечай нешчасьлівай парады Камітэт паставіў у сваім назове словы, якія адразу настаражылі супроць яго ўсе нерасейскія народы СССР, выклікаючы недавер і падазраньне што да шчырасьці ў намерах вызваленьня.

Камітэт, які ў мінулым году паўтараў свой кліч „непрадрашэнства" не радзей хіба, як бальшавікі свой кліч „міру" нейк да гэтай пары ніяк ня можа заценіць, што „прадрашэнства" ўводзіць ужо ён сам у сваім назове словамі „Народы Расеі". Камітэт зусім неадчувае й дагэтуль, што гэтымі словамі ён згары ставіць усе народы СССР у палітычную залежнасьць ад народу расейскага, прызнаючы гэтым тэрмінам [illegible] недэмакратычны прывілей для аднаго народу да панаваньня над іншымі, аддаючы іх быццам у нейкую палітычную собскасьць.

У выніку — усе народы насторожыліся, падазраючы нейкі подступ. І з гэтага ня трэба дзівіцца. Каб лепш зразумець сутнасьць справы, трэба адно ўсьведаміць сабе, якое-б зрабіла ўражаньне й які быў-бы палітычны вынік, калі-б нехта сяньня задумаў закласьці напр. Камітэт народаў Аўстра-Вугоршчыны, ды заклікаў да супрацоўніцтва туды чэхаў, славакаў, сэрбаў, харватаў, палякаў і вугорцаў. Трэба быць, хіба, наіўным, каб думаць, што народы гэтыя, улучна нават з вугорцамі, сустрэлі-б такі камітэт із захапленьнем.

А аўстрыйскі імпэр'ялізм сяньня-ж толькі нягрозны гістарычны нябожчык, толькі няпрыемныя ўспаміны сон недалёкага мінулага, калі тымчасам ап'янелы новымі вялікімі здабычамі расейскі імпэр'ялізм на самым узвышшы свайго красаваньня.

Нават і самы прадстаўнікі мадэрнага расейскага імпэр'ялізму, бальшавікі, даўно выкінулі назоў „народы Расеі" з свайго палітычнага карыстаньня. Зрабілі некалі яны гэта як тактычную ўступку для народаў СССР, для захаваньня самой імпэрыі. Сяньня-ж трымаюцца й надалей гэтага, паколькі назоў гэты дазваляе ім лепш маскаваць запраўдную безаглядную асыміляцыйную расейскую палітыку сучаснай Масквы, даведзеную імі цяпер, пры помачы мадэрнай тэхнікі, да небывалае дасканаласьці. Як ведама, на кручок такой маскіроўкі далася злавіцца й такая немалая палітычная рыбіна, як індускі прэм'ер Нэгру, які з усёй наіўнасьцю нясьведамага справы чалавека асьветчыў нядаўна, што нацыянальнае пытаньне ў Саветах разьвязанае „ўзорна".

Дык, як бачым, ужо блізу 35 год тэрмін „народы Расеі" здадзены ў музэй аджылых палітычных рэквізытаў самою Масквою, як за грубы, за прымітыўны, неадпаведны патрэбам маскоўскага імпэр'ялізму XX сталецьця. І ня гледзячы на гэта ды не агляючыся на няпрыемлівасьць яго для народаў СССР, Амэрыканскі

Новая пяцігодка - і Палесьсе

Адным з паважнейшых плянаў новае сталінскае пяцігодкі, аб якой так шмат гаворыцца на адчыненым кагадзе ў Маскве 19-тым зьезьдзе ВКП(б), — гэта плян асушэньня 40.000 кв. кілямэтраў Палескіх балатоў, над якім думалі, а навет браліся ўжо й працавалі і стары царскі ўрад, і Польшча, а цяпер надобрае ўзяліся бальшавікі.

Усе гэтыя акупанты Беларусі бачылі ў асушцы вялізарных палескіх забалочаных прастораў, якія можна ператварыць у 3 з паловаю мільёны гектараў ураджайнае зямлі, перадусім свае выгады й карысьці. Бальшавіком-жа асушэньне непраходных балатоў Палесься, памінаючы ўжо добрую нагоду да прапаганды навонкі, — дасьць яшчэ й магчымасьць вынішчыць, ці прынамсі паменшыць нацыянальную беларускую партызанку, якая ўжо гады хаваецца ў недасяжных гушчарох Палесься, прыносячы бальшавіцкім акупантам вялізарных клопаты й страты.

Плян асушэньня Палесься быў прадстаўлены 19-му зьезду партыі Н. Патолічавым, сакратаром камуністычнае партыі БССР.

Газэта „Нью-Ёрк Таймс" ад 10-га кастрычніка прысьвяціла выступленьню Патолічава адмысловы артыкул із невялічкай картай.

Ня будзем паўтараць тут усяго гэтага артыкулу, бо бальшыня статыстычных дадзеных аб Палесьсі, прыводжаных у ім, добра ведама ўсім нам. Цікавае ў ім для нас можа адно, што аўтар артыкулу ўспамінае аб масавай эміграцыі жыхароў Палесься ў Амэрыку напачатку нашага стагодзьдзя, яшчэ за часоў царызму, каб ратавацца ад голаду й галечы ды аб тым, што й за часоў Польшчы (1920-1939) у акупаваных ёю часьцінах Палесься ўсьцяж трывалі старыя голад і нястача. Цікавая таксама зацемка і аб тым, што ў часе мінулае апошняе вайны, балаты нашага Палесься былі апрацыйнай базай вялізарнае беларускае партызанкі, якая давала да запраўдные роспачы нямецкага акупанта.

Партызанка гэтая, дадамо ад сябе, вядзецца на абкружаных балатамі глухіх абтоках Палесься й да сяньня і асушэньне палескіх балатоў ня вынішчыць яе так хутка. Бо там, дзе пануюць гвалт і прымус, — заўсёды будуць і змагары проці гвалтаўнікоў ды паняволнікаў, людзі, якія не шкадуюць жыцьця, каб скончыць нарэшце і з новымі пяцігодкамі, што суляць беларусам адно яшчэ цяжэйшую, катаржную працу, і з выступленьнямі розных масхалёў Патолічавых ад імя **беларускага** народу, і з усёй той савецкай манной ды зьдзекам, якіх нацярпелася ўжо ўдосыць нашая Бацькаўшчына-Беларусь.



Карта Палесься, пададзеная газэтай „Нью-Ёрк Таймс".

Вайна Беларускае Народнае Рэспублікі із Савецкім Саюзам

27-га лістапада 1920 году на Случчыне выбухла збройнае паўстаньне супраць бальшавіцкае арміі, якая ў той час наступала з Усходу, імкнучыся сілаю зброі заняць прастору Незалежнае Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР). Гэтае паўстаньне, дзякуючы свайму шырокаму абсягу, патрыятычнаму ўздыму паўстанцаў, іхнай ахвярнасьці й зацятасьці ў змаганьні — сымбалічнае для беларускага народу. Гадавіна ягонага выбуху сталася беларускім нацыянальным сьвятам, што сьвяткавалася сьпярша проста як гадавіна паўстаньня, а цяпер — як Дзень Беларускіх Герояў, калі ўшаноўваецца памяць усіх беларусаў, што аддалі сваё жыцьцё ў змаганьні за незалежнасьць Беларусі.

Аднак, назоў „паўстаньне" для гэтага так геройчнага беларускага збройнага чыну не адказвае ані ягоным памерам, ані падрыхтоўцы, ані спосабу вядзеньня баёў. Гэта была запраўдная вайна. Вайна БНР із СССР.

Бо паўстаньнем з гледзішча чыста вайсковага завецца збройнае выступленьне групы людзей, арганізацыяў, ці навет усяго народу супраць ворага, які **паняволвае** дадзены народ і край. Падрыхтоўваецца яно ў тайніцы перад акупантам і выбухае спантанічна. Як прыклад тыповага паўстаньня можна прывесьці паўстаньне 1863 году, у якім брала ўдзел і беларускія паўстанцы пад правадырствам Каліноўскага, або й крывавае польскае паўстаньне супраць немцаў, што выбухнуўшы было ў Варшаве ў жніўні 1944 году.

Але калі народ арганізуе сваю абарону хай бы й на частцы свае вольнае дзяржавы і ўступае ў бой із ворагам, які яшчэ толькі імкнецца паняволіць яго, — гэтага ўжо ня можна назваць паўстаньнем. Гэткі збройны чын — завецца вайною.

Пастараемся-ж цяпер разгледзець Слуцкі збройны чын з гледзішча чыста вайсковага. Перад гэтым, аднак, пералічым у кароткіх словах агульныя здарэньні на Случчыне, якія папярэдзілі збройнае выступленьне случчакоў.

Ужо ў пачатках 1918 году ў Слуцку быў арганізаваны Беларускі Нацыянальны Камітэт. Бальшавікі, якія ў канцы 1918 году займалі прастору БНР, прыйшоўшы у Слуцак, гэты Камітэт зьліквідавалі, а ягонага старшыню Паўла Жаўрыда арыштавалі. Калі-ж у канцы 1918 году пачалася польска-бальшавіцкая вайна і ўлетку 1919 году Случчына апынулася пад польскай акупацыяй, разагнаны бальшавікамі камітэт сабраўся неўзабаве ізноў да пачаў працаваць. Камітэт арганізаваў беларускую міліцыю.

У шэрагі гэтае міліцыі уступалі прафэсыйныя беларускія афіцэры й падафіцэры. Гэткім чынам, пад маскай міліцыі (маска была неабходная, каб зьмыліць польскія акупацыйныя ўлады) арганізаваліся беларускія вайсковыя кадры. Тымчасам, у кастрычніку 1920 году ваенныя дзеяньні паміж польскаю й бальшавіцкаю арміямі спыніліся. Бакі, што змагаліся, устанавілі дэмаркацыйную лінію, якая бегла на захад ад Случчыны. За гэтую лінію палякі адвялі сваю армію й Случчына сталася на нейкі час вольнай. Гэты момант вельмі ўдала выкарысталі случчакі. Доўга не чакаючы, яны склікалі Зьезд Случчыны, які адбыўся 14-га лістапада 1920 году. На зьезд, як упаўнаважаны Ураду БНР, прыбыў Павал Жаўрыд, якому ў часе зьмены акупацыяў удалося вызваліцца з бальшавіцкае турмы. Паміж іншымі пастановамі, Зьезд вынес рэзалюцыю збройна бараніць незалежнасьць БНР у выпадку новага бальшавіцкага наступу. Як часовая ўлада на пакіненай польскім акупантам прасторы зьездам была выбраная Рада Случчыны, якая й пачала дзейнічаць ад імя Ураду БНР. Як улада на мяйсцох, пры валасьцёх былі арганізаваныя валасныя камітэты. У першую чаргу Рада Случчыны ўзялася за арганізацыю беларускага войска. З гэтай мэтай была праведзеная мабілізацыя. Зьмабілізаваныя случчакі, як адзін, масава павалілі ў Слуцак. Міліцыя, аб якой успаміналася вышэй, сталася кадрай для арганізацыі войска. Прафэсыйныя беларускія афіцэры, як падпалкоўнік Гаўрыловіч, капітаны Сокал-Кутылоўскі, Анцыповіч, Семянюк і шмат малодшых афіцэраў ды падафіцэраў пачалі арганізоўваць із зьмабілізаваных людзеў рэгулярныя палкі. Аб гэткіх падзеях на Случчыне не маглі не дачуцца бальшавікі. Яны накіравалі на Слуцак сваю армію. Канцэнтрацыя й арганізацыя зьмабілізаваных жаўнераў яшчэ ня была цалкам скончаная, калі бальшавіцкая армія пачала набліжацца да Слуцку. Ня будучы гатовая да прыняцьця бою, Рада Случчыны перанесла канцэнтрацыю і арганізацыю беларускіх аддзелаў у Семежава, што із стратэгічнага гледзішча было вельмі правільным. У Семежаве арганізаваліся два палкі, Слуцкі — пад камандай падпалкоўніка Гаўрыловіча й Грозаўскі — пад камандай капітана Семянюка. Гэтыя два палкі, а да гэтага дапаможныя аддзелы, разам 10.000 чалавек, тварылі дывізію пад камандай капітана Анцыповіча. 27-га лістапада 1920 году гэтая дывізія й перайшла ў контр-наступ супроць бальшавіцкае арміі, як рэгулярная армія БНР.

Гэтак, на вольнай частцы прасторы БНР, была праведзеная мабілізацыя й арганізацыя вайсковых адзінкаў, якія і выйшлі на змаганьне із захопнікам. Гэтага ня можна назваць інакш, як вайной.

Перайшоўшы ў контр-наступ, армія БНР атрымала над бальшавіцкай арміяй колькі бліскучых перамогаў. Бальшавікі пачалі адступаць, сьцягваючы на Случчыну новыя баёвыя адзінкі. Урэшце, пасьля вельмі доўгатрывалага і незвычайна геройчнага змаганьня, нашае войска, ня маючы ніякага заплечча, адкуль магло-б папаўняць свае баёвыя адзінкі людзьмі й матар'ялам, пачало ў зацятых баёх абступаць на захад.

31-га сьнежня 1920 году яно перайшло раку Лань і апынулася на прасторы, акупаванай палякамі. Палякі раззброілі нашае стомленае баямі войска й зачынілі яго ў лягеры. У гэтым выпадку польскія ўлады, што акупавалі землі БНР, паказаліся вернымі саюзьнікамі бальшавікоў. За гэтае Сталін ім сяганьня вельмі прыгожа дзякуе.

Як відаць з цягу змаганьня, армія БНР у складзе толькі аднае дывізіі патрапіла пяць тыдняў зацята супроцьстаяць у шмат разоў дужэйшаму ворагу. Параўноўваючы цяпер слуцкае змаганьне із польска-нямецкай вайной 1939 году, калі нямецкая армія зьліквідавала добра азброеную і колькасна вялікую польскую армію на працягу трох тыдняў, ці француска-нямецкую вайну ў 1940 годзе, калі нямецкая армія вельмі хутка цалкам разбіла французаў, якія мелі выдатных генэралаў з першае сусьветнае вайны й тэхнічна былі вельмі добра азброеныя, — дык нашая маленькая армія, у пасьпеху арганізаваная на Случчыне й вельмі блага азброеная, паказала запраўды цуды ваяўнічасьці.

Кароткатрывалая вайна БНР із СССР мела шмат нагодаў разгарнуцца у вайну вялікую, бо адважныя збройныя выступленьні беларусаў супроць бальшавікоў выбухалі ў тыя часы адначасна й шмат дзе яшчэ. Заходняя Беларусь у гэтым выпадку магла-б служыць арміі БНР як выпадовы абшар проці бальшавіцкае збройнае сілы.

На жаль, гэтак ня сталася.

На перашкодзе гэтаму сталі не ўпадак духу, не зьнеахвочаньне, ня слабасьць беларускіх аддзелаў, якія якраз да апошняга баранілі кажны крок роднае зямлі, а вылучна польская акупанты й чужая нам польская армія, якая стаяла за плячыма нашых геройічных змагароў.

Ф. Кушэль.

Музэйны рэквізыт

(Канец з 1-ае бал.)

Камітэт знайшоў патрэбным прыўзьняць аджыты й адкінены ўсімі палітычны рэквізыт ды ўвесьці яго ў свой афіцыйны назоў.

Вынік быў ведамы. Усе народы адразу аднесьліся да новай арганізацыі з недаверам, як да магчымае прылады чужых, варожых іхнаму нацыянальна-вызвольнаму змаганьню дзейнікаў. Толькі прадстаўнікі расейскіх вялікадзяржаўных „дэмакратычных" эміграцыйных партыяў пачуліся адразу „як шчупакі ў вадзе" ды ўжо — як паказаў Вісбадэн ды Штарнбэрг — нацэліліся гуляць у прапанаваным супольным фронце ролю паўнаўладных „хазяінаў" іншых народаў, да чаго, выглядала, запрашаў іх і сам назоў Камітэту.

І можа дзеля гэтага якраз да сяньня ўся арганізацыйная ініцыятыва Камітэту паралiжуецца зь вялікаю стратаю часу й энэргіі й вялікаю шкодаю для так важнай палітычна справы — змаганьня з бальшавізмам.

Калі, пасьля году гаркіх дасьветчаньняў Амэрыканскі Камітэт запраўды думае аб дабры вызвольнай справы народаў СССР, дык даўно ўжо пара разам із пэрсанальнымі зьменамі, пазбыцца перадусім і свайго першароднага граху — „прадрашэнства" у назове.

Б. Б-ч.

Сучасны Іран

Падзеі ў Іране (Пэрсыі) ўжо даўно турбуюць палітычных дзеячоў. Падзеі гэтыя запраўды пагражаюць паважнаю небясьпекаю сьвету. Кіруючая партыя ўзначальваецца сяньня ў Іране прэм'ерам Масадыкам ,што атрымаў ад парляманту неабмяжаваныя паўнамоцтвы і ёсьць па праўдзе гаспадарам дзяржавы. Іранскаму шаху даводзіцца толькі „рабіць выгляд" валадара, бо свае волі ён ня мае. Пасвараныя у Іране і ўсе значнейшыя партыі. Скрайныя элемэнты патрабуюць з аднаго боку дзяржаўнага перавароту, з другога — канчальнага разрыву з Ангельшчынай, распальваючы ненавісьць да чужынцаў. Гэтыя скрайныя фанатыкі, здаецца, вельмі моцна падтрымліваюцца камуністымі. Згодна із загадам з Масквы, яны ўсьцяж ладзяць дэманстрацыі, арганізуюць напады на прадстаўнікоў Ангельшчыны ды Амэрыкі і не ганьбуюць, навет, вулічнымі бойкамі. Масква, што мае паблізу Ірану моцныя радыёстанцыі, штодня вядзе агітацыю супраць „чужаземных гвалтаўнікоў" і намагаецца выклікаць у Іране камуністычны пераварот. Нясупынныя непарадкі й напады у сталіцы Ірану Тэгэране й на правінцыі, робяць палажэньне Іранскае манархіі вельмі хісткім. Сябры дынастыі й вышэйшыя ўрадаўцы сьпяшаюцца пакінуць краіну з абы-якое прычыны. Вырашальнай падзеяй у жыцьці Ірану стаўся нафтавы канфлікт з Ангельшчынай, які й дагэтуль не заладжаны. Іран, як ведама, краіна незвычайна багатая нафтай, якой цікавіцца сяньня ўвесь сьвет. Да нядаўнага часу, уся нафтавая справа знаходзілася ў руках Англа-Іранскае нафтавае кампаніі, якая мела больш 1.5 мільярдаў капіталу. Ангельшчына, якая сорак год узбагачалася на іранскай нафце, займела ў Іране незьлічоныя багацьці. Апрача таго і ўсе тэхнічнае кіравецтва кампаніі было ў руках ангельцаў. Жыхарства-ж Ірану жыло ў вялікай беднасьці. У мінулым годзе прэм'ер Масадык наважыў „нацыяналізаваць" маёмасьць Англа-Іранскае кампаніі. Ангельшчына збаялася выкарыстаць збройную сілу, аглядаючыся на Савецкі Саюз. У выніку — Чэрчылю засталося адно пагадзіцца на сьмелы крок Масадыка. Аднак, Ангельшчына спрабавала перад гэтым усе магчымыя спосабы ўзьдзеяньня, каб паставіць Іран на калені. Спэцыялістыя па здабыцьцю нафты былі вывезеныя ў Ангельшчыну, наліўныя судны, што вывозілі нафту, былі выведзеныя з Ірану, Пэрсыцкая затока была блякіраваная. Гэта спрычынілася да спыненьня дабыцьця нафты й дзяржаўны дэфіцыт Ірану сягае сяньня 90 мільёнаў даляраў. Затое непамерна вырас струмень дыпляматычных нотаў, якімі вось ужо колькі часу абменьваюцца Лёндан з Тэгэранам. Абедзьве стараны скардзяцца на вялізарныя страты й намагаюцца сыскаць іх на суграціўніку. У справу ўмяшалася й Амэрыка, што дапамагае Ангельшчыне. Ірану была высланая супольная нота, падпісаная Труманам і Чэрчылем, дзе яны прабавалі пераканаць Іран накіраваць справу на разгляд Гаагскага Трыбуналу. Але Масадык ня толькі адхіліў гэтую ноту, але й абвесьціў на ўвесь Іран, што яго „хацелі купіць за 10 мільёнаў". Кагадзе ў Іран быў выкліканы ведамы нямецкі фінансісты Шахт (дарадчык Гітлера), але й ён ня даў рады дапамагчы пасвараным старонам. Тымчасам, вакол іранскае справы пачаў навівацца клубок розных інтрыгаў. І ўся гэтая справа даўно магла-б перайсьці ў „гарачэйшыя мерапрыемствы", — але Іран стаіць перад фінансавай катастрофай і палітычным хаосам, а гэта прымушае Масадыка стрымлівацца ды йсьці на ўступкі. Тае-ж самае фінансавае катастрофы й магчымасьці палітычнага перавароту ў Іране баіцца й Ангельшчына. Карыстаючы-жа з усяго гэтага, сваім звычаем, Саветы, што прабуюць і тут лавіць рыбку ў мутнай вадзе.

Апошнім часам Масадык патрабаваў ад Ангельшчыны, каб тая заплаціла Ірану 67 мільёнаў даляраў на рахунак Англа-Іранскае Кампаніі. Ангельскі ўрад на гэта не пагадзіўся. Масадык наважыўся не ўступаць і зьбіраецца парваць дыпляматычныя дачыненьні із Ангельшчынай. Палажэньне ў Іране ацэньваецца, як вельмі паважнае.

СЬВЯТА ПРАЦЫ

Дзень першага верасьня сьвяткуецца у ўсёй Амэрыцы, як Дзень Працы. Гэтак вядзецца тут ужо на працягу 65 год. Ідэя сьвяткаваньня нарадзілася ў 1882 г. на парадзе аднае з наймацнейшых у тыя часы працоўных арганізацыяў, што звалася „Рыцарамі Працы". Спачатку гэта была таемная арганізацыя масонскага тыпу. Пасьля да яе далучыліся вугляконы Пэнсыльвэніі, а яшчэ праз нейкі час яна ахапіла й іншых працоўных розных штатаў, лічачы больш 500.000 сяброў. У 1884 годзе адзін з сяброў арганізацыі прапанаваў сьвяткаваць кажны першы панядзелак верасьня, як дзень, прысьвечаны працы. Гэтая прапанова прайшла й сяньня Дзень Працы — сьвяткуецца у ўсёй Амэрыцы, уключаючы Порта-Рыка, Гаваі ды Аляску. Сьвяткуюць сяньня Сьвята працы 15 мільёнаў працоўных, задзіночаных у шматлікіх працоўных юніях Амэрыкі.

Мартын Люціч

„Галгофа"

(Канец)

Міхей адчыніў вароты ўласнай сядзібы і ўвёў каня ў двор, перахрысьціўшыся ад радасьці. Адпрог яго, паставіў у стайню, думаючы, каб не забыцца пазьней напаіць, і ўкаціў воз пад павець. Потым нацягаў вады із студні і пачаў паіць карову; пасьля падкінуў сьвіньням у начоўкі вараней мерзлай бульбы із бручкай і рэдзькай і тады толькі ўвайшоў у хату.

Тут, быццам, было ўсё ў парадку. Дастаў із печы капусту, наліў яе ў міску і пачаў есьці, думаючы аб немцах:

— Бог іх ведае, чаго яны да мяне чапіліся? Можа дзе-небудзь што-небудзь ізноў здарылася? Муку толькі мне папарассыпалі й пабрудзілі...

У гэта час із-запечка пачуўся дробны й тоненькі сьмяшок, нібы пабраскваньне званочка: хі-хі-хі-ііі...

Міхей спакойна аблізаў лыжку і падняў яе ўгару, быццам перад ім сядзеў нехта, каму варта трэснуць ёю па ілбе.

— А гэта яшчэ хто такі? — запытаў.

Сьмяшок узмоцніўся, зьліўся ў нейкі амаль мэханічны клёкат, быццам у таго, хто там за-запечкам, саскочыла, як у будзіку, накручаная спружына і ён ужо ня ў стане цяпер спыніцца. Міхей зразумеў гэты сьмяшок так, як і належала: чалавек пабойваецца, каб яго ня ўзялі за каршэнь і ня выставілі за дзьверы за самаўпраўства.

Не падымаючы галавы, Міхей без ахвоты заўважыў:

— Што за сьвет: блукаюць па зямлі, парушаюць спакой сумленных і ціхіх людзей... — Потым ужо больш сур'езна: — Хто ты такі й куды нясуць цябе твае ногі? Кажы!..

Сьмяшок адразу-ж абарваўся. І той, хто сьмяяўся, відаць было, сеў на печы.

— Ты угадал! Вот, хожу, брожу... а куда, й сам не знаю?!..

І затым, раптам, пачаў апавядаць, як каля вёскі напалі на яго тры вялікія рабыя сабакі. Адбіцца ня было чым, і ўцякаць таксама некуды... І ён кінуўся ў рэчку. Вада сьцюдзеная, ён зьмерз і зайшоў ў першую хату, каб пагрэцца. У хаце нікога ня было і ён узьлез на печку і там нечакана заснуў... І сьнілася яму, нібы...

Міхей абарваў яго:

— Ты мне байкі не апавядай! — ведаючы добра, што ніякіх такіх трох рабых сабакаў ў вёсцы няма, — увогуле сабак амаль няма, бо іх павыстралялі немцы. І потым ужо сувора: — Паперы у цябе якія ёсьцека?

— Паперы? Гм, паперы?! А на что они тебе, те паперы?

— Хто ты і адкуль, мушу я ведаць! Прыймаць людзей забаронена — прыйдуць немцы і цябе й мяне павесяць...

— А ты разве за немцев?

— Я? Ні за тых і ні за другіх! Я сам па сабе, свой глузд маю!.. Але я мушу ведаць!

Міхей узяў ад стала міску і лыжку і накіраваўся зь імі да парогу, дзе былі палічкі для пасудзьдзя. Пакінуў іх там і зноў вярнуўся да стала.

— Ага! Паперы? Хорошо, я тебе сейчас покажу паперы...

І той, што на печы, засунуў руку ў кішэню шыняля, які быў пад ім.

— Всякие паперы бывают! — прамовіў. — Вот, к примеру, такого сорта документы успокоят тебя?

Міхей узьнёс галаву і ўбачыў вочка скіраванага на яго нагана. Той, што трымаў рэвальвер, ізноў заліўся дробненькім сьмяшком.

— Бог ведае, што чалавек думае? — заўважыў Міхей спакойна. А потым пагрозьліва: — Схавай сваю рурку, каб я яе й на бачыў! Тутака, у сваёй хаце, я заўжды найду спрыту скруціць табе рукі так, што і ня войкнеш!..

— Ага! Ты желаешь знать, кто я такой? Изволь! Я прислан „хлопцами" но развёрстку: чтобы к завтрешнему вечеру собрали тону мукі!..

— Якімі хлопцамі? — перапытаў Міхей, быццам ня ведаючы.

— Ты еще не знаешь хлопцев? Ну, то узнаешь — партизанами...

— Якімі партызанамі? Партызаны ёсьцека ўсялякія...

— Ну, конечно, не вашими, белыми... Красными партизанами, советскими... Теперь знаешь?

Міхей доўга маўчаў.

— Ты, чалавеча, із гэтага не жартуй: прыйдуць немцы, павесяць абодвых... Цяперацька прыймаць нікога не дазволена...

І Міхей ізноў падняўся із лаўкі.

— Хозяин, хозяин, постой! Ты никуда не уходи. Если ты заявишь, завтра спалим всю деревню — это ты должен знать!

— Я нікуды ня йду — мне трэба каня напаіць з дарогі... адказаў Міхей.

Выйшаў на двор і доўга стаяў ў задуме: „Бог яго ведае, што тут рабіць? „Наважыў, пакуль што, напаіць каня. Выцягваючы із студні вядро вады, думаў: „І праўда, прыйдуць назаўтрае й выпаляць... І зноў-жа, гэтыя могуць наскочыць?!.. Што тут рабіць?" Разважыў: гэтыя могуць не наскочыць, але тыя абавязкава спаляць! Калі вярнуўся ў хату, бадзяка папрасіў запалку прыкурыць. Міхей паднёс каганец і ў гэты час ўбачыў, што рукі ў бадзякі трасуцца.

— Сьцюдзена? — усьміхнуўся Міхей.

— Как?

— Я пытаю — сьцюдзена на печы, зьмерз?

— Так, промерз, когда промок.

— А дзе гэта так прышлося праз рэчку перабірацца?

— Вот, пришлось!.. — ухіліўся той ад адказу. І потым: — Зна-

»Сялянка« на Менскай сцэне

(да сотых угодкаў пастаноўкі).

Апошнімі тыднямі ўся польская прэса прысьвечвае ня мала месца 75-тым угодкам дня сьмерці ведамага кампазытара Станіслава Манюшкі. Аднак, аб сувязях Манюшкі із Беларусяй нідзе не ўспамінаецца. Памінаецца й такі гістарычны факт, як тое, што якраз сёлета прыпадаюць сотыя ўгодкі стварэньня Манюшкай першай беларускай опэры „Сялянка". Няма ведама, ці польская крытыка стыдаецца гэтага здарэньня, ці крыху баіцца, — мы глядзімо на яго, як і на шмат іншых гэткіх пытаньняў із гістарычнай об'ектыўнасьцяй, дарма што гэта часамі й балюча.

Станіслаў Манюшка, з паходжаньня беларус, як ці мала іншых мастакоў (Глінка, Міцкевіч, Дастаеўскі, Карловіч) аддаў свае здольнасьці творчай працы не для роднай зямлі. Дарма, што ў сваіх музычных творах ён шырака выкарыстаў народную творчасьць роднай Беларусі, яго зусім справядліва трэба лічыць аснавапаложнікам польскае нацыянальнае опэры. І тутка мы хочам адно прыпомніць нашаму грамадзтву тое, чым, ці кім быў Манюшка перад тым, як пайшоў служыць польскай культуры. А расказаць ёсьць аб чым.

Станіслаў Манюшка нарадзіўся ў Меншчыне. Ён быў ня толькі беларусам з паходжаньня, але і ўсё свае маленства й маладыя гады правёў на сваёй бацькаўшчыне Беларусі. Гэтта ён і гадаваўся, й вырас на чалавека, заўсёды чуючы вакол беларускую мову, слухаючы беларускія казкі, песьні, наглядаючы за беларускімі абрадамі ды звычаямі, бяручы ўдзел у народных сьвятах, гульнях, карагодах. Яны глыбака запалі ў ягоную душу, ды так там і засталіся. Будучы юнаком, Манюшка навязаў лучнасьць із перадавымі тагачаснымі беларускімі культурнымі коламі, займеў там прыяцеляў і сяброў. Сярод беларускае мастацкае інтэлігенцыі таго часу вылучаўся беларускі пісьменьнік і адзін з пачынальнікаў беларускае драматургіі Вінцук Дунін-Марцінкевіч. Паміж ім і Манюшкай завязалася добрае сяброўства. Гэтаму сяброўству неўзабаве давялося перайсьці і ў творчае цеснае супрацоўніцтва. Калі Дунін Марцінкевіч напісаў тэкст для беларускае опэры пад назваю „Сялянка", ён зьвярнуўся па ейнае музычнае афармленьне да свайго прыяцеля, які ўжо лічыўся тады таленавітым музыкаю. Манюшка вельмі ахвоча ўзяўся за напісаньне музыкі для опэры „Сялянка". Зьмест „Сялянкі", праўда, быў не асабліва арыгінальны, а ідэя й зусім із жыцьцёвага гледзішча наіўная — спроба памірыць, задзіночыць у штодзённым жыцьці паноў і прыгоннае беларускае сялянства. Галоўная гераіня опэры паненка Юлія, пераапраненая за беларускую сялянку (адсюль і назоў опэры) выказвае гэтую ідэю гэткімі словамі: „Бог на небе паноў і мужыкоў зароўна ўважае". Аднак, магчымасьцяў для творчасьці кампазытара было тут шмат: і любоўная лірыка, і малюнкі чароўнае беларускае прыроды й масавыя сцэны сялянскіх характарных звычаяў, песьні, скокі, карагоды. Ведаючы беларускую песенна-танцавальную народную творчасьць з маленства, чула стаўячыся да яе, Манюшка патрапіў паказаць яе ў опэры ў вельмі багатым ды яскравым выглядзе. Паколькі бясколерна „паказэённаму" прадстаўленая была ў опэры „польская" частка дзеі, натолькі маляўніча, тэмпэрамантна й жыцьцёва-праўдзіва прадстаўлялася ейная народная, беларуская частка (тэкст опэры, як тады было ў звычаі, выкарыстоўваў дзьве мовы: польскую для паноў і беларускую для сялянаў). Манюшка йшоў гэтта ня толькі за тэкстам і лініяй свайго сябры Дуніна-Марцінкевіча, але й тварыў собскую кампазытарскую трактоўку.

Опэра „Сялянка" была пастаўленая на сцэне Менскага тэатру Палека, які пазьней згарэў дарэшты, якраз сто год таму — у 1852 годзе. Удача ейная ў гледача была вялізарная. Асаблівым гонар ды авацыі дасталіся на долю двох сяброў — аўтараў — Дуніна-Марцінкевіча, які сам гуляў адну з галоўных роляў (Навума) і Манюшкі, які кіраваў усёй музычнай часткай паказу. Вялізарны мастацкі й грамадзкі рэзананс пастаноўкі зацеміла й афіцыйная расейская ды польская крытыка, што нешкадавала словаў пахвалы самой опэры, аўтарам і выканальнікам. „Сялянку" давялося шмат разоў паўтараць, і кажны раз із нязменшаю за папярэдняю ўдачай.

Трэба заўважыць, што „Сялянка" паводле формы ня была яшчэ той опэрай, якую мы атрымалі ў спадчыне ад італьянцаў (у гэткай опэры — увесь тэкст сьпяваецца) і якую мы ведаем сяньня. Гэта быў паказ, дзе спалучаўся і слоўны тэкст, і сьпеў, і музыка, і танец — нешта падобнае да нямецкага Зінгшпілю. Але трэба таксама заценіць і тое, што з гэтага якраз зінгшпілю вырасла нацыянальная нямецкая опэра, як з вадэвілю — опэра француская. І зусім правільна й справядліва мы ацэньваем „Сялянку", як першую беларускую опэру, тым балей, што ў ёй Манюшка выкарыстаў усе запраўдныя опэрныя формы: арыі, рэчытацывы, дуэты, ансамблі, хоры, інструмантальныя эпізоды й балетныя сцэны. Для гісторыі беларускае культуры, й частка ва гісторыі музыкі, „Сялянка" мела й мае вялікае гістарычнае значаньне **першага прафэсыйнага нацыянальнага музычна-тэатральнага твору,** які ўпершыню ў усёй паўніне, паказе й мастацкасьці кампазытарскай тэхнікі адкрыўся вачом грамадзкасьці, паказваючы далейшы шлях беларускаму музычнаму мастацтву.

Супрацоўніцтва Манюшкі з Дуніным-Марцінкевічам, а таксама й праца Манюшкі над беларускім фальклёрам працягвалася й пазьней. Імі створаныя былі яшчэ й іншыя рэчы беларускіх „зінгшпіляў": „Залёты", „Гапон", „Вечарніцы" (дзе працаваў над музыкай побач із Манюшкам і кампазытар Крыжаноўскі).

Цікава, што „Сялянка" ды іншыя рэчы Манюшкі, узятыя з багатае крыніцы беларускае песеннасьці, не засталіся бяз уплыву й на **польскую опэру.** У польскіх опэрах Манюшкі, асабліва-ж у опэрах „Галька" і „Страшны двор" можна знайсьці ня толькі беларускія ўплывы, але й музычнавакальныя эпізоды, што цалкам перайшлі сюды з опэры „Сялянка". І ў гэтым няма нічога благога, ці паніжальнага для польскае музыкі. Наадварот, як кажнае народнае творчае пранікненьне, яно магло толькі уліць у яе жывую й сьвежую плыню. Трэба сказаць, што запраўды паважная польская крытыка ніколі не затойвала факту сувязяў Манюшкі з беларусамі, як вонкавых, гэтак і глыбейшых, творчых, нутраных, (кніга Зямкевіча — „Станіслаў Манюшка"), ды іх і немагчыма схаваць, нагэтулькі яны выразныя.

Гэткім чынам, беларускае грамадзтва, што ўшаноўвае побач із польскай грамадзкасьцю 75-ыя ўгодкі сьмерці свайго суродзіча й слаўнага майстры Станіслава Манюшкі, адначасна сьвяткуе й вялікае беларускае культурнае сьвята — сотую гадавіну першае беларускае опэры на беларускай тэатральнай сцэне. Сто год — зусім не малы працяг часу у гісторыі культуры й вельмі паказальны для нацыянальнага жыцьця. Ён меў сваё значаньне й свае асягненьні ў нашым культурным жыцьці. І хай сяньня Беларусь паняволеная чужынцамі, — разьвіцьця ейнае культуры ім усёткі не запыніць. Бо калі Манюшка паклаў пачатак беларускаму опэрнаму мастацтву, — дык за сто год беларусы патрапілі ўжо стварыць ці адну запраўды мастацкую опэру.

Мікола Кулікові ч.

ХАРАСТВО БЕЛАРУСІ

Вясна на Палесьсі.

Новы лёзунг Савецкага Саюзу

„Жыць будзе яшчэ лепш, жыць будзе замажней"

Галоўны орган партыйнае бальшавіцкае прэсы, газэта „Праўда", у надрукаваным ня гэтак даўно артыкуле, прысьвечаным будучым „дасягненьням" новае сталінскае пяцігодкі, аб якой так шмат гаворыцца на адчыненым кагадзе ў Маскве 19-ым зьезьдзе ВКП(б), упярщыню падае й новы лёзунг гэтае пяцігодкі: „Жыць будзе яшчэ лепш, жыць будзе замажней". Відаць, стары лёзунг аб лепшым ды весялейшым жыцьці крыху ўжо збрыдаў савецкаму чалавеку, яму здавалася, апрача весялосьці, нарэшце пад'есьці удосыць, і вось на зьмену старому, „радаснаму" — абвешчаны новы, „замажнейшы" кліч.

Без чарговага лёзунгу Савецкі Саюз жыць не патрапіць. Усе ведаюць, што кажны з гэтых клічаў маня, хлусьня, брахня, — але яны гэтак увайшлі ў кроў, ці лепш кажучы, уеліся ў косьці савецкім людзям, што бяз іх, здаецца, й жыць было-б нямёка. Нашая былая падсавецкая эміграцыя досыць добра пазналася на практыцы із старым бальшавіцкім лёзунгам аб лепшым жыцьці ды весялосьці. Ад гэтае весялосьці яны, дзякуй Богу, якраз і ўцякалі.

А што-ж цяпер абяцаюць сваім галодным нявольнікам савецкія ўлады? Ды вось што: — За пяць год, піша „Праўда", — значна вырасьце продаж масла, мяса, цукру, пасудзьдзя, самакатаў, радыяпрыймальнікаў... Павялічыцца сетка сталоўкаў і крамаў".

Хай і так. Хай гэта усё й запраўды зьдзейсьніцца. Але словы „значна вырасьце" можна як гуму, расьцягваць у розныя бакі. Калі параўнаць прырачоныя дасягненьні із сяньняшнім палажэньнем савецкага грамадзяніна, які ўсе гэтыя пералічаныя „Праўдай" рэчы бачыць рэдка, або й ніколі, — дык словы „значна вырасьце" могуць запраўды пацешыць галоднага падсавецкага чалавека. Аднак, калі параўнаць абяцанкі новае савецкае пяцігодкі із магчымасьцямі грамадзянаў іншых, несавецкіх краінаў, — гэтая ўцеха здасца адно зьдзекам, іроніяй.

Бальшавікі ўжо блізу 35 год цешаць сваіх падданых надзеяй на лепшую будучыню: „Цяпер, праўда, цяжка, але папачакайце, хутка будзе лепей". І народ, запалоханы на сьмерць тэрорам, чакае, цярпіць ...і спадзяецца. Бо нечым-жа жыць трэба.

Запраўднасьцяй у савецах не пражывеш. Гэта ўцямілі навет і самы бальшавіцкія партыйцы. І яны узяліся пацяшаць сваіх грамадзянаў байкамі аб жудасным жыцьці працоўных у краінах за зялезнай заслонай, дзе згодна із іхнімі словамі пануюць „зьбядненьне масаў, беспрацоўе, няволя й навет сьмерць". Савецкая прэса ўвесь час таксама намагаецца пераканаць сваіх чытачоў, быццам у Амэрыцы сяньня 13 мільёнаў беспрацоўных, што канаюць з голаду на вуліцах, што работнікаў на фабрыках б'юць, калі яны не хочуць працаваць звыш палажаных гадзінаў, а за павольную працу калечаць, а часта й зусім забіваюць... што тысячы галодных людзей ад раніцы да ночы стаяць пад брамамі прадпрыемстваў, патрабуючы працы й хлеба, што іх разганяе, катуючы, паліцыя й г. д. Кажны гэткі жахлівы артыкул канчаецца запэўненьнем: „зусім ня тое у нас, у нас"... і пачынаецца прапагандная балбатня, дзе, як і ў папярэдніх зьвестках, няма ані слова праўды.

Ведама, што савецкі грамадзянін часта-густа й паверыць у праўду „Праўды", падумае: „хоць і ў нас ня рай, але ўсёткі, хоць галодна, але неяк жывецца". І няма чаго дзівіцца, калі за зялезнай заслонай людзі ня ведаюць як мы жывем.

Аб харчаваньні-ж гэтта й гаварыць навет ня выпадае. Тое, што савецкаму чалавеку абяцаюць праз пяць год „у значна большай колькасьці", мы маем тут у неабмежаваных памерах. І бальшавіцкія абяцанкі аб павялічэньні нормаў масла, мяса й цукру гучаць тут запраўды як нейкі гаркі й трагічны жарт.

І яшчэ адно: усе мы, што ужо больш менш абстяляваліся, працуем і зарабляем, купляем собскія хаты й самаходы, адчуваем глыбокі жаль за тых, хто ўсьцяж яшчэ змушаны чакаць праз пяць год... на павялічэньне продажы масла ці цукру.

Нам глыбака баліць іхная доля, доля галодных фабрычных працоўных, абог й сялянаў, якія, здаўшы „датэрмінова" збожжа дзяржаве й атрымаўшы грамы за свой цяжкі працадзень, ужо на другі месяц пасьля гэтага, прымушаныя цягнуцца ў места й станавіцца на ўсю ноч у чаргу за баханкаю хлеба, які яны цалюткі год рабілі — сеялі, расьцілі, зьбіралі... і здавалі дзяржаве.

Селянін.

ешь, что, хозяин, ты больше никуда не выходи!..

— Ды я нікуды... Куды-ж я на сваю галаву — абодвых на шыбеніцу тады!.. Ўхаце буду, ўхаце...

Бадзяка, нібы, павесялеў. Міхей сеў на лаўку і пачаў ціха апавядаць, час ад часу заглядаючы ў акно і прыслухоўваючыся:

— І што цяперака за сьвет — ратунку няма... Ходзяць, шукаюць, паляць... От, паехаў сяньня ў млын, гора набраўся: немцы затрымалі, муку адабралі й самаго не хацелі выпусьціць... Цэлы дзень з канём пракарпеў! А ці ты што-небудзь сяньня еў?

— Утром — ел, но потом не довелось... Но это ничего — мы в лесу привыкли жить по волчьи... Хорошо, вот, что пришлось полежать на печи, так надоели эти землянки?

— А вы так у лесе й жывеце, як ваўкі?

— Больше в лесу...

IV.

Была ўжо, мабыць, першая гадзіна ночы, калі бадзяка сядзеў каля патэльні за сталом і еў яечню.

— А баба у тебя есть? — запытаў, раптам.

— Няма ў мяне бабы, — адказаў Міхей. — Ужо другі год, як без бабы, забіла й дзяцей і бабу снарадам, як праходзіў фронт, а я выцалеў таму, што ня было ўдому...

— Хорошо ты меня угостил — вот, кабы еще бабу доставил...

— Якую бабу?

— А хоть бы какую — мужчине без бабы тяжело!..

— Вярзеш, ты, чалавеча, дурноты! Ніякіх такіх бабаў я ня ведаю...

І якраз у гэты момант на вуліцы пачулася нейкае рыпеньне, нейкі моцны крык, нібы у вёсцы зьявілася адразу сотня пьяных. Міхей, перш за ўсё, прыцісьнуў далоню аганьчык каганца, а потым кінуўся да акна: заглянуў ў яго і ўбачыў нямецкія шынелі ды каскі. Адскочыў ад акна і энэргічна штурхануў бадзяку:

— Уцякай, браце, як найхутчэй!..

— Может...

— Уцякай!

Бадзяка схапіў з печы шыняліну й апусьціў у кішэню руку. Выскачыў на двор. Але праз зусім кароткі час пачуліся адзін па адным два стрэлы: спачатку з рэвольвера, а потым із вінтоўкі. Куля дагнала ўцякаючага ў колькіх кроках ад хаты...

Міхей перахрысьціўся, думаючы аб толькі што выйшаўшым з хаты. Але ў той-жа час на дварэ пачуліся крокі і, ня было сумліву, жаўнерскія, — стукалі падкоўкі. Дзьверы рыпнулі і, чуваць, жаўнеры былі ўжо ў сенцах. Міхей падскочыў і сам адчыніў дзьверы, ведаючы тое, што ў сенцах цемра. Дарэмна, сьвяціліся ліхтарыкі, снапамі зеленаватага сьвятла абмацваючы сьцены. Затым чатыры колцы — з чатырох рук высунуліся з цемры. Яны паказаліся Міхею чатырма дзюркамі ад вялікіх ключоў, якімі звычайна крамнікі замыкаюць свае крамы, а царкоўныя старасты — цэрквы... І зноў, як і раніцой:

— **Halt!**

І адзін па адным ўсе чатыры ўвайшлі ў хату. Поверх шынялёў, праз плячо, у іх былі нейкія давалі шырокія істужкі, а на шыі віселі ланцугі, да якіх былі прымацаваныя зялезныя круглыя нумары. Міхей стаяў адраньцелы сярод хаты. Адзін з жаўнераў, як відаць старшыня, паглядзеў на каганец, на сьцены, потым на стол. Убачыў патэльню із недаедзенай яечняй, хлеб, відэлец і нож.

— **Wer war hier?** (Хто тут быў) спытаўся ён панямецку.

Але Міхей нічога ня мог зразумець і не адказаў.

— Партызант?!

Гэта Міхей зразумеў і пакруціў галавой.

— **Durchsuchen das Haus!** (Абшукаць дом), — крыкнуў немец.

Жаўнеры пачалі заглядаць пад лаўкі, у печ, пад печ, пад ложак. Міхей, як і раней, стаяў сярод хаты. У той час, жаўнер скідаў з паліцаў гаршкі ён складаў чарапкі ад іх у груд. Другі жаўнер узламаў скрыню. Міхей падняў дошкі і паглядзеў іх каля дзьвярэй. Трэці жаўнер заглянуў на печ і раптам покатам зьляцеў адтуль.

— **Mine!** — крыкнуў.

Міхей і гэта зразумеў і рукі й вусны ягоныя затрэсьліся. І няследзячы на сваю вялізарную сілу, адчуў, што галава яго пайшла кругам. Ня мог утрымацца на нагах і сеў на лаўку. Сьцяў зубы і адчуў — сьцюдзены пот змачыў ягоную кашулю! „Удружыў госьць! — падумаў. — Ну, што-ж, схапіць цяперака гэтую міну і сабе пад ногі!" Але было за позна. Жаўнеры дасталі із-запечка міну й на ягоных вачох вынялі нейкі мэханізм.

— Партызант?!

Міхей зноў пакруціў галавой.

Старшыня выняў нейкія паперы і пачаў іх чытаць іншым. Нейкія гукі далятаялі да Міхея, але ані яго ня трывожылі. Потым, усе ў чатырох, падпісаліся пад паперай. Далей: адзін з жаўнераў зьняў з крука ў сьцяне лейцы, тыя самыя, із якімі Міхей сяньня езьдзіў ў млын. Зрабіў на адным із канцоў засмаргу і пайшоў з хаты. Тры іншыя павялі за ім Міхея. Першы падставіў пад пераякладзінай над варотамі нейкую калодачку й прывязаў да пераякладзіны лейцы...

Міхей стаяў і думаў пра муку, пра карову, сьвіней і пра тое, што на падворку ляжыць застрэляны чалавек, чаго ніколі ня было навет у сьне. Яго штурханулі й загадалі стаць на калодачку. І толькі цяпер Міхей зразумеў, што ягоная „Галгофа" наблізілася. І як толькі гэта зразумеў, у галаве ў яго нешта зрушылася, павярнулася й ён пачаў губляць раўнавагу. Жаўнер пасьпешыў закінуць яму на галаву засмаргу і выбіў з пад ног калодачку........

....

„І хто на страсе, той хай ня сыходзіць узяць што-колечы з дому свайго"...

1947, Баварыя.

З Беларускага Жыцьця

СПРАВА КУПЛІ БЕЛАРУСКАГА ДОМУ.

У нядзелю 12-га кастрычніка у залі пад сьв. Траецкаю Царквою адбылося пашыранае паседжаньне Нью-Ёркскага царкоўнага камітэту.

Між іншага, на паседжаньні была яшчэ раз дакладна абмяркаваная й справа набыцьця Беларускага Дому. Пасьля нарадаў, усе сябры, прысутныя на сходзе, прыйшлі да згоды, што Дом, да куплі якога прыступае беларускае грамадзтва Нью-Ёрку, павінен быць гэткі, каб там зьмясьціліся Управа БАЗА, усе афіліяваныя пры БАЗА беларускія арганізацыі, а таксама й Беларуская Праваслаўная Аўтакефальная Царква. Такім чынам, набыты дом станецца гэтта запраўдным цэнтрам беларускага жыцьця. Для заладжаньня гэтае так паважнае, ды нялёгкае справы, камітэт набыцьця Бел. Дому, які быў выбраны на агульным сходзе беларусаў Нью-Ёрку сёлета ўлетку, пачне ўжо ў найбліжэйшым часе зьбіраць грошы на гэтую мэту. Грошы будуць зьбірацца па падпісных лістох, як ахвяры, а такасма продажай адмысловых акцыяў, якія, па узгадненьні із амэрыканскімі законамі й заладжаньні зьвязаных із гэтым фармальнасьцяў, неўзабаве будуць выпушчаныя.

МІЖНАРОДНАЯ ВЕЧАРЫНА У МАНЧЭСТАРЫ.

У канцы верасьня сёлета ў адным з найбольшых прамысловых местаў Ангельшчыны, — Манчэстары адбылася міжнацыянальная вечарына, ладжаная Каардынацыйным Камітэтам Уцекачоў з Цэнтральнае ды Усходняе Эўропы. Удзельнічалі ў вечарыне й беларусы Манчэстару — сябры Каардынацыйнага Камітэту, побач із летувісамі, латышамі, палякамі ды украінцамі.

Як і заўсёды, беларусы не пашкадавалі стараньняў, каб належна падтрымаць на гэтым міжнацыянальным выступленьні гонар роднае Беларусі. Паміж іншага, беларускі бел-чырвона-белы сьцяг (заля была ўпрыгожаная нацыянальнымі сьцягамі сяброў Каардынацыйнага Камітэту) найвыразьней і найпрыгажэй выдзяляўся з паміж усіх іншых.

Існуе ў Манчэстары й свой беларускі клюб. Месьціцца ён у прыватным доме аднаго з тутэйшых беларусаў сп. К. Ва[illegible]. Клюб вельмі старанна й прыгожа [illegible]сталяваны. У ім ёсьць бібліятэка й чытальня. У большай залі адбываюцца сходы, нацыянальныя сьвяткаваньні й Багаслужбы, адпраўляныя сьвятаром БАПЦарквы айцом А. Крытам.

Усё гэта вымоўна сьветчыць, што манчэстарскія беларусы аддана й актыўна працуюць для беларускае нацыянальнае справы.

ВЯСНА У АРГЕНТЫНЕ.

У нас у Нью-Ёрку сыплюцца з дрэваў лісты, дзьме сьцюдзёны вецер, — адным словам, ужо восень. А нашыя сябры ў Аргентыне сьвяткавалі кагадзе Сьвята Вясны, якое прыпадае тут на 21-га верасьня й лучыцца із Днём Моладзі.

З гэтае нагоды Управа Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне наладзіўшы была сяброўскую вечарыну, прысьвечаную вясьне й моладзі. На вечарыне, апрача моладзі, было шмат і старое беларускае эміграцыі, што прыехала сюды гады таму. Эміграцыя гэтая што раз больш пачынае апошнім часам цікавіцца жыцьцём і працай маладых беларускіх арганізацыяў Аргентыны.

Увесь даход з вечарыны, якая мела вялікую ўдачу, пайшоў на папаўненьне касы Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне.

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЗЬЕЗД БЕЛАРУСАУ ПАУНОЧНАЕ ФРАНЦЫІ.

З ініцыятывы групы француcкіх беларусаў і з дапамогаю беларускае студэнцкае моладзі з Лювэну, якая на працягу летняга адпачынку ад навукі, паразумеўшыся із беларускімі арганізацыямі ў Парыжы, зрабіла аб'езд усіх большых беларускіх асяродкаў у Францыі, 28-га верасьня адбыўся арганізацыйны зьезд беларусаў акругаў Норд і Па-дэ-Кале.

Зьезд пачаўся ўрачыстай Божай службай, адслужанай сьв. А. Смаршчком, пры ўдзеле хору Беларускага Студэнцкага Ансамблю пад кіраўніцтвам сп. праф. М. Равенскага. Пасьля службы й абеду пачаўся сам зьезд. Адкрыў яго старшыня ініцыятыўнае групы сп. Я. Лазута. Старшынёю зьезду выбраны быў сп. інж. Л. Рыдлеўскі, старшыня галоўнае управы „Хаўрусу". Пасьля ягонага прывітаньня, слова папрасіў генэральны сакратар Хрысьціянскага Сындыкату Францускіх Работнікаў сп. Рубэ-Туркуэн. У сваёй прамове ён запэўніў новапаўсталы аддзел у сваёй падтрымцы й дапамозе. Прадстаўнік Задзіночаньня Украінскіх Работнікаў у Францыі гэтаксама шчыра вітаў зьезд. З прывітаньнямі выступілі й прадстаўнік Прэзыдэнта БНР, старшыня Саюзу Беларусаў у Бэльгіі, рэфэрэнт культурна-асьветных справаў ЦБАА, Сакратар Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне й Старшыня ЗБК у Бэльгіі. Пасьля прывітаньняў сп. Цімафейчык, старшыня ЗБК прачытаў цікавы рэфэрат на тэму „Беларуская эміграцыя й ейныя актуальныя праблемы".

На старшыню новае арганізацыі быў выбраны стары дзеяч сп. Раманоўскі, на сакратара сп. Лазута, на скарбніка сп. Кашталян. Трэба спадзявацца, што прыклад беларусаў прамысловых акругаў Норд і Па-дэ-Калэ ня міне бяз сьледу й што беларусы іншых акругаў Францыі дзе яшчэ няма беларускіх арганізацыяў, пачнуць арганізавацца. У гэтым ім заўсёды із шчыраю ахвотаю дапамогуць іхныя суродзічы, ужо задзіночаныя.

М. Кургановіч

АБ ЧЫМ ТРЭБА ВЕДАЦЬ КАЖНАМУ.

Прыпамінаем нашым суродзічам, якія ня так даўно прыехалі ў ЗША, што яны не павінны забывацца аб тым, што напрацягу першых двух год яны мусяць два разы на год рэгістравацца ў Камісіі Іміграцыі ды Натуралізацыі ў Вашынгтоне. Рэгістравацца трэба, выпаўняючы адмысловыя анкеты, якія можна дастаць у кажным аддзеле Камісіі Іміграцыі й Натуралізацыі (Галоўны Урад гэтае ўстановы месьціцца на Columbus St., недалёка Брадвэю ў Нью-Ёрку). Рэгістравацца трэба не пазьней 1-га сьнежаня й 1-га ліпеня кажнага году. Апрача гэтага, трэба раз у год, у студзені паведамляць свой адрыс у Камісію. Рабіць гэта трэба, выпаўняючы адмысловыя карткі, на якіх ужо выдрукаваны адрыс установы й якія можна дастаць на кажнай пошце. Рабіць гэта трэба й тады, калі міне два гады й рэгістравацца ў Вашынгтоне ўжо ня трэба. Патрэба рэгістрацыі спыняецца толькі тады, калі даная асоба стаецца амэрыканскім грамадзянінам.

І яшчэ адно:

Згодна із новым эміграцыйным законам, г. зв. „першыя паперы" ужо не патрэбныя. Можна падаваць просьбу аб прызнаньні амэрыканскага грамадзянства бяз „першых папераў" і таму гэтыя паперы ўжо не выдаюцца. Але бываюць выпадкі, калі яны ўсёткі патрэбныя. Напр. ёсьць шмат працаў у ЗША, на якія прыймаюцца толькі амэрыканскія грамадзяне, або людзі, што маюць прынамся „першыя паперы" (напр. на прадпрыемствах, што выконваюць ваенныя заказы). У гэткім выпадку можна выпаўніць анкету з просьбай аб прызнаньні „першых папераў", як гэта было дагэтуль, але ў просьбе трэба зазначыць, што вам ведамае аб спыненьні выдачы папераў дзеля атрыманьня пазьней амэрыканскага грамадзянства, але што „першыя паперы" патрэбныя вам дзеля атрыманьня працы ці чаго іншага. у гэтым выпадку, „першыя паперы" будуць вам выдадзеныя.

„Віці"

Часапіс маладога пакаленьня.

Днямі выйшаў ратататарным друкам 2-гі нумар часапісу Згуртаваньня Беларускае Моладзі й Беларускага Студэнцкага Таварыства ў ЗША — „Віці".

Кажнае новае беларускае друкаванае выданьне успрыймаецца гэтта на эміграцыі як яшчэ адна перамога ці асягненьне грамадзкае арганізаванасьці. Тым балей цешыць, калі гэтае новае выданьне — часапіс моладзі, які тут, у ЗША — ёсьць першым друкаваным адлюстраваньнем жыцьця нашага маладога пакаленьня. Палітычнае, нацыянальнае й наагул культурнае значаньне гэтага часапісу ня выклікае ніякіх сумляваньняў. Ён ня толькі сьветчыць аб жыцьцёвай моцы самое нашае моладзі, але пасярэдна і аб жыцьцёвасьці ўсяго нашага беларускага грамадзтва.

Ідэя часапісу „Віці" й мэта ягонага выдаваньня мо' найлепш выўленая радкамі вершу „Родны Край" (Б. Д-ч), зьмешчанага ў 2-гім нумары часапісу:

„Здалёку подзьмух родных ніў —
Душой прарочаю я чую.
Там, дзе радзіўся і дзе жыў,
Туды вярнуцца лятучу я."

Змагацца „за Родны Край, за свой народ", захаваць нацыянальныя пачуцьці ды імкненьні, — значыцца захаваць і на чужыне беларускую душу, засьветчыць аб сваёй нацыянальнай самабытнасьці, апрычонасьці, не разьвеяцца як імгла між чужынцаў, не загінуць. Што можа быць вышэйшае, сьвяцейшае за гэтую мэту?

Жаданьне нацыянальна ўзгадаваць моладзь, наладзіць тутка, на эміграцыі ня толькі собскае, асабістае жыцьцё, але й жыцьцё грамадзкае, нацыянальнае, — ужо адно выклікае ў дачынсньні да „Віцяў" добрыя, чулыя, прыхільныя пачуцьці. Яны ўсьцяж мацнеюць, калі ўзяць на ўвагу, што часапіс выдаецца пры вельмі сьціплых матар'яльных магчымасьцях нашае моладзі, блізу вылучна з ахвяраў сяброў ЗБМ ды студэнтаў, іхнаю працаю, як арганізацыйнаю, гэтак і творчаю (аўтары зьмешчаных у часапісе артыкулаў — сама моладзь).

Аднак, ня толькі гэтыя прычыны робяць „Віці" мілай і пацяшальнай праяваю. Цешыць і сам зьмест часапісу. Невялікі памер ягоны і ратататарны друк не памяншаюць вартасьці й разнастайнасьці тэматыкі. Тут і гісторыя Беларусі, і літаратураведа, і навука (астраномія, мэдыцына, прыродаведа) й мастацкая частка, прадстаўленая празаічнымі, паэтыцкімі ды навет музычнымі творамі як старэйшых беларускіх мастакоў, гэтак і маладых будучых іхных спадкаемцаў. Даволі багаты й аддзел хронікі сусьветных і беларускіх падзеяў, аддзел адпачынку ды гумару й г. д. Усе гэтае — бясспрэчныя плюсы часапісу. Вельмі сымпатычная й сама форма падачы матар'ялу. Тут і намаганьні падмацаваць кажны нарыс дасьледчымі вынікамі й стараньні не засушыць іх, а наадварот, атуліць мяккою лірычнасьцяй, шчырасьцяй („Барбара Радзівілянка", „Страх ці адвага"), падаць навуковы матар'ял у лягчэйшым выглядзе фантастыкі („За якія сто год"), павязаць „вечныя" зьявы прыроды із сучасным беларускім жыцьцём („Ніягара").

Усёж найпрыямнейшае й найбольш радаснае ў абодвух нумарох „Віцяў" — гэта асабліва падчыркненае, скрозь вычуванае каханьне да Бацькаўшчыны. Гэтае каханьне й стаецца тым стрыжнём, вакол якога навіваецца ўвесь матар'ял часапісу. Каханьнем роднага прасяклы кажны артыкул, пачынаючы ад зваротаў рэдакцыі да зьвесткаў з аддзелу хронікі. Якраз яно, гэтае каханьне дае „Віцям" права й моц сьмела й голасна крыкнуць: „Ганьба тым, што думаюць гэтта й дбаюць адно аб сабе!" І гэты гарачы, хай ня выказаны, заклік нашае моладзі павінен прымусіць задумацца тых сябелюбаў, якія ёсьць у кажнай эміграцыі і што [illegible] роднай справе, а собскім амбіцыям ці собскай кішані.

„Віці" чытаюцца лёгка, адным цягам і чамусьці ўражаньне ад іх астаецца гэткае, быццам чуеш нейкую новую, сьвежую беларускую песьню, сьпяваную із шчырасьцяй, ахвотаю й маладым імпэтам.

Дык трэба адно пажадаць „Віцям", каб яны несьлі роднае слова „у ўсе бакі — на захад і усход, на поўнач і па паўдня", абуджаючы маладую беларускую думку, заклікаючы на змаганьне за Незалежную Бацькаўшчыну.

Нашае-ж старэйшае грамадзтва павінна й маральна й матар'яльна подтрымаць моладзь у ейных творчых пачынаньнях. Гэта — ягоны абавязак і перад самым сабой, і перад будучыняй.

К.

Вялікія й малыя злодзеі

(З жыцьця ў паняволенай Бацькаўшчыне)

Адзіным злачынствам, за якое на паняволенай бальшавікамі Беларусі пагражае турма, катаваньні й завочна найцяжэйшы прысуд, або й высылка бяз прысуду у канцлягеры на загубу й сьмерць — гэта палітычная ненадзейнасьць, або нат найменшая цень палітычнага адхіленьня ад партыйнае лініі.

Аднак, савецкія суды пільна караюць і дробных злодзеяў, маленькіх людзёў за прысабечаньне кавалка хлеба, жмені каласоў ці жмутка воўны, якія яны змушаныя „красьці" самы ад сабе, каб не загінуць. За гэткія „злодзействы" ў Саветах лёгка дастаць 5-10 год „прынудпрацы", што ў запраўднасьці блізу роўнае сьмяротнаму прысуду.

Затое дзіўна шмат дароўваецца савецкім службоўцам-буйным зладзеям. Гэта пераважна маленькія партыйцы або кандыдаты ў сябры партыі. Калі яны пракрадаюцца ў адным месцы, — іх перакідаюць у іншае. Калі яны спракудзяцца й гэнам, іх часам звальняюць, але неўзабаве прыймаюць на працу ізноў, адно рэдка засудзіўшы на адбыцьцё невялікае кары. Вытлумачыць гэтае зьявішча можна толькі тым, што ўвесь бальшавіцкі бюракратычны апарат, што кіруе палітычным ці эканамічным жыцьцём нашае Бацькаўшчыны — бясчэсны да рэшты й калі-б яго пачалі „чысьціць", дык ня было-б каму кіраваць. Апрача таго, усе гэтыя службоўцы, у бальшыні насланыя ў Беларусь з Расеі, „свае людзі", верныя „правадыру й партыі".

Дарма што так, усёткі й іхныя справы выплываюць часам на зьверх і „народныя суды" паняволенае Беларусі прымушаныя імі займацца. І хоць у „цэнтральнай рэспубліканскай прэсе БССР" аб выпадках гэткіх успамінаецца рэдка, — у раённых яны твораць даволі пярэсты малюнак, бо там успамінаюцца побач і дастаюць аднолькавую кару й работнік фабрыкі, што ўзяў кавалак непатрэбнага зялеза й калгасьнік, што „украў" жмут самым ім накошанага сена для галоднае каровы — і спэкулянт ці запраўдная „акула" паважнае дзяржаўнае ўстановы. Ведама, найніжэйшы вымер кары атрымлівае якраз апошні, мо' таму, што бальшавіцкая дзяржава сама — найвялікшы злодзей.

ЗА ПАУВЯДЗЁРКА ФАСФАТУ І ЖМЕНЮ СЕНА

Да разьдзелу найдрабнейшых па праўдзе, але сувора караных злачынстваў належыць у Саветах, побач з крадзежамі з калгаснага поля ці варштату й тое, што завецца „перaступленьнем дысцыпліны працы" — невялікае навет спазьненьне на працу. У савецкай краіне, што йдзе да камунізму гэтае „злачынства" караецца лягерамі прымусовае працы. Але аб гэтым „краіне сацыялізму" ужо й зусім не выпадае гаварыць і таму бальшавіцкія газэты ня пішуць ніколі аб асобных выпадках, а толькі агульна аб „барацьбе народных судоў з саботажнікамі працоўнае дысцыпліны".

Затое ўсе газэты адкрыта пішуць аб дробных крадзежах ня мясцох працы. Найбольш такіх выпадкаў здараецца ў савецкіх калгасах. Газэты падаюць напр. аб „крадзежы" калгасьнікам Сьвіркоўскім паўвядзерка штучнага гною, ссыпанага на полі калгасу „Вольная праца" Жлобінскага раёну, або аб работніку мэблёвае фабрыкі ў тым самым Жлобіне, які перанёс па кавалку да хаты матар'ял для кухоннае паліцы. Меру кары ні у адным з гэтых выпадкаў газэты не падаюць, але, як ведама з дэкрэтаў, яны вельмі вялікія, бо тут справа йдзе аб „крадзеж сацыялістычнае й дзяржаўнае маемасьці."

ВЯСЁЛАЕ ЖЫЦЬЦЁ У РАЁНАХ

Інакш стаіць справа з буйнейшымі злодзеямі. У раённых цэнтрах ёсьць шмат утульных і цёплых месьцейкаў, дзе няма ніякага кантролю, а таму — пянства й самаволя урадаўцаў пануюць скрозь. Паведамленьні аб нясупынных „растратах" у правінцыяльных каапэратыўных прадпрыемствах блізу ня сыходзяць з балонкаў раённае прэсы, аднак, рэдка хто ў гэткіх выпадках караецца. Прыкладам можа быць

КАР'ЕРА ТАВАРЫША ІВАНОВА

Гэта ўжо не „маленькая рыбка", а вялікі дырэктар прамысловае арцелі „Адраджэньне", прысланы партыяй недзе з Маскоўшчыны „спэцыялісты-таваравод".

Высьвятлілася, што ён, выражаючыся проста, крадзе грошы арцелі. Толькі тады зацікавіліся ягонай біяграфіяй. Высьвятлілася, што Іванова ўжо ці раз судзілі за „растраты". Ён часта мяняў месца працы ня толькі ў гарадах, але й ў рэспубліках. Кіраўніцтва арцелі Іванову верыла, бо яго прыслаў райком ВКП(б) Беларусі, даўшы яму найлепшыя атэстацыі. Іваноў жыў распусна, часта ня прыходзіў на працу, браў з касы арцелі грошы і ўрэшце „зьнік з гораду". Ведама, ніхто яго ня судзіў, бо й ня шукаў.

Гэткіх прыкладаў шмат. І навет бальшавіцкая прэса паняволенае Беларусі, якая наагул вельмі ня любіць пісаць аб злачынствах „сваіх людзёў", хоць штодня ціша аб дробных „крадзежах" галодных калгасьнікаў, — змушаная час ад часу аб іх успомінаць.

Біблія Скарыны у расейскіх стараверау

У рамане ведамага расейскага пісьменьніка Мельнікава Пячэрскага „У лясах і на гарах" ёсьць цікавыя балонкі, якія беспасярэдна датычацца беларускае друкарскае справы. Раман гэты малюе жыцьцё расейскіх стараабрадцаў. Вось-жа аўтар, апісваючы асаблівую любасьць і пашану гэтых стараабраднікаў да старых кніжок, сьцьвярджае, што асаблівай павагай карысталася біблія выданая славутым нашым першадрукаром доктарам Пранцішкам СКАРЫНОЮ, якая была вельмі каштоўным праскім выданьнем. Экзэмпляры гэтае бібліі, хоць і каштавалі вялізарныя грошы, вельмі старанна высочваліся й купляліся расейскімі стараабраднікамі.

Мельнікаў Пячэрскі гэтак падае поўную назову скарынінскае бібліі (падаецца ў транскрыпцыі Пячэрскага):

— **„Библия Русска, выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька. Богу ко чти и людзям посполитым к доброму наученью.** Прага **Чэшская 1517-1519".**

Побач із бібліяй Скарыны, падае аўтар, сярод стараабрадцаў карысталіся пашанаю і ўсе выданьні беларускае друкарні Мамонічаў у Вільні, якая друкавала кніжкі з сямідзесятых гадоў XVI стагодзьдзя да пачатку XVII ст.

Вельмі цікавыя для нас у рамане „У лясах і на гарах" Пячэрскага й іншыя дадзеныя з жыцьця заволжскіх старавераў. Напр. яны ведалі й сьвяткавалі гэткія нашыя сьвяты, як Купальле, Радаўніцу, Русальную нядзелю, Сямік (Сёмуху). У мове іхнай часта сустракаліся гэткія чыста нашыя словы, як волат, вырай, поўнач, прытуліць, вітаць, вітацца. Ведалі яны й нашыя працоўныя абрады й звычаі, як талака, завіваньне волатавай барады на дажынках... Цікава, як тлумачаць усе гэтыя зьвесткі нашыя моваведы, этнографы ды гісторыкі?

М. К.

ЦАРКВА У АМЭРЫЦЫ

Шмат хто лічыць Амэрыку краінай наскрозь матарыялістычнай і навет бязбожнай. Шмат хто думае, што адзіным богам, якому амэрыканцы моляцца — гэта даляр. Аднак, хоць гэтага мо й ня відаць так выразна ў вялізарных мэтраполіях, як Нью-Ёрк ды іншых вялікіх прамысловых цэнтрах, бальшыня амэрыканцаў — людзі рэлігійныя, хай рэлігійнасьць іхная й ня зусім супадае із нашай. Навет больш. Возьмем для прыкладу хай-бы гэтак званую тутка „старую эміграцыю", людзёў, што гады таму прыехалі сюды зь Беларусі. Калі параўнаць іхную рэлігійнасьць із нашай, — параўнаньне выпадзе пэўне-ж не на нашую карысьць.

Згодна із дадзенымі, зьбіранымі штогод — наведваньне амэрыканскіх сьвятыняў усьцяж павялічваецца. Асабліва пачала ўзрастаць лічба малельнікаў ад 1949 году. Сяньня — 58% ўсяго жыхарства ЗША — актыўныя сябры 252-ох розных рэлігійных арганізацыяў. Лічба гэтая сьветчыць аб паважным значаньні царквы ў амэрыканскім жыцьці.

Сярод амэрыканцаў налічваецца 52 мільёны пратэстантаў розных цэркваў, 29 мільёнаў каталікоў, 9 мільёнаў мэтадыстых, 7 мільёнаў баптыстых, 5 мільёнаў жыдоў, дакладна не падлічаныя сотні тысячаў праваслаўных і мільёны тых, што, не належачы да ніякае царкоўнае арганізацыі, ходзяць у сьвятыні й моляцца.